еженедельная газета, в которой освещаются политические, экономические, социальные, культурные и другие аспекты жизни в стране и за рубежом.

В ходе исследования было проанализировано 20 номеров газеты и методом сплошной выборки найдено 55 эллиптических предложений. Так, было выявлено 31 эллиптическое предложение, в котором опущен глагол со значением бытия, наличия, обнаружения, что составляет 56,4 % от всех заголовков: *Порядок в танковых войсках. Звезды космоса на орбите Минска. Что в хоккейном рюкзаке? Хлеб на столе и в поле* [5].

В номерах газеты было найдено 5 эллиптических предложений-заголовков со значением движения, а это 9,1 % от всего количества: *Время назад. Капля за каплей. Кто за ней?* [5].

Из всех просмотренных заголовков было выявлено 1 предложение, в котором опущенный глагол означает восприятие, что составляет 1,8 % от всех предложений: *Какая песня без баяна?* [5].

Также было найдено одно эллиптическое предложение, где глагол имеет значение речи и мысли (1,8 %): *Специалисты о новшестве Указа № 463* [5].

Среди заголовков найдено 2 предложения с опущенным глаголом энергетического движения, а это 3,6 % от всех заголовков: *На все сто! Зерна в землю* [5].

Следует отметить, что среди выявленных эллиптических предложений оказались те, которые не вошли ни в одну из представленных в научной литературе семантических групп. По нашему мнению, это глаголы, имеющие следующие значения: 1) получения: *Ответственность на себя* [5]; 2) манеры поведения: *Губки бантиком, бровки домиком* [5]; 3) предоставления: *Возможности каждому. След в жизни. Жилье для молодой семьи* [5] и др. Их количество — 15 предложений, что составляет 27,3 % от всех эллиптических предложений.

**Заключение.** Самой многочисленной семантической группой эллиптических предложений-заголовков статей республиканской газеты «7 дней» являются конструкции, в которых опущены глаголы бытия, наличия, обнаружения, что свидетельствует о специфике предлагаемой читателю информации.

Такие конструкции с пропуском в речи структурно необходимого языкового элемента придают заголовку броскость, яркость и в то же время сжатость и краткость. Очевидно, что такие предложения приемлемы только в сфере названий и практически невозможны в содержании самой публицистической статьи. Они максимально эффективны в привлечении внимания читательской аудитории, способствуют аккумуляции мысли. Однако следует помнить о целесообразном использовании эллиптических конструкций, так как возникает опасность негативного стилистического эффекта.

**Список цитируемых источников**

1. *Валгина, Н. С.* Синтаксис современного русского языка : учеб. для вузов / Н. С. Валгина. — Изд. 2-е. — М. : Высш. шк., 1978. — 439 с.

2. *Валгина, Н. С.* Современный русский язык : учебник / Н. С. Валгина, Д. Э. Розенталь, М. И. Фомина ; под ред. Н. С. Валгиной. — 6-е изд., перераб. и доп. — М. : Логос, 2002. — 528 с.

3. *Пипченко, Н. М.* Современный русский язык : синтаксис словосочетания и простого предложения : учеб. пособие / Н. М. Пипченко. — Минск : БГУ, 2009. — 215 с.

4. *Алиева, Э. А.* Типы и функции эллиптических конструкций в художественном очерке С. Кржижановского «Салыр-Гюль» / Э. А. Алиева // Филология и лингвистика. — 2017. — № 2. — С. 25—27.

5. 7 дней : общеполит. газ. — Минск : БелТА, 2014—2018.

УДК 821.161.3:82-1Ягадніцкі

**Л. А. Жураўлёва**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ЛАКАТЫЎНАЯ ЛЕКСЕМА «МЛЫН» У ХРАНАТОПЕ ПАЭМЫ А. ЯГАДНІЦКАГА «ЖОРНЫ ЛУХТЫ»

**Уводзіны.** Не толькі ў асобных людзей, а і ў этнасаў ёсць радзіма. Яны маюць сваю першасную тэрыторыю, якая вызначаецца непаўторным спалучэннем элементаў ландшафту. Сучасны беларускі філосаф Валянцін Акудовіч гаворыць пра Беларусь як пра сталы «суб’ект еўрапейскай прасторы» [1, с. 51]. Яе топасную цэласнасць, у сваю чаргу, утвараюць пэўныя лакальныя элементы. Тыя з іх, што часта адлюстроўваюцца ў мастацкіх тэкстах як месца дзеяння ці ажыццяўлення нейкай сітуацыі і надзяляюцца сімвалічным сэнсам, у сучаснай навуцы атрымалі назву локусаў культуры. Звычайна гэта прасторавыя паняцці, выражаныя канкрэтнымі назоўнікамі, якія «метафарызуюць нейкую ўласцівасць быцця» [2, с. 13]. Іх аналіз дазваляе паглыбіць асэнсаванне пэўнай гістарычнай эпохі.

**Асноўная частка.** Надзвычай распаўсюджаны ў беларускай літаратуры локус млына. Мы звернемся да паэмы баранавіцкага аўтара А. Ягадніцкага «Жорны лухты», галоўным героем якой з’яўляецца млынар з Наваградчыны Ціхон Сарока, а ў аснову сюжэта пакладзены драматычныя падзеі яго жыцця.

© Жураўлёва Л. А., 2019



Репозиторий БарГУ

Дзеянне паэмы пачынаецца ў Заходняй Беларусі, якая да 17 верасня 1939 г. знаходзілася пад уладай Польшчы, і млын з'яўляецца прыватнай уласнасцю сям'і Сарокаў. Перш за ўсё млын выступае рэальным аб'ектам, з якім цесна звязана жыццё герояў і які ўспрымаецца як зрокава, так і на слых: пеніцца і шуміць вада, круціцца млыновае кола, грукаціць каменне. У паказе А. Ягадніцкага млын выступае своеасаблівым інфармацыйным цэнтрам даваеннага часу. «Спрадвеку запаветным быў куток, / Дзе бавіла канец свой зерне: / Тут чуткі завіваліся ў клубок, / Курэлі люлькі, бы ў таверне; / Тут ведалі пра кошты на ўраджай, / Пра пахаванні і хрысціны, / Пра папуасаў незвычайны край / І пошук гною на Хібінах...» [3, с. 149]. Аўтар падагульняе: «Млынар заўсёды чуе шмат навін» [3, с. 149]. Невыпадкова з пачаткам вайны Ціхону прапануюць служыць немцам і паведамляць важныя для іх звесткі. А калі Сарока адмаўляецца, яму пагражаюць спаліць млын або паставіць млынаром паліцаевага сына — «Каб не было там шкодных збораў…» [3, с. 150]. Пазбавіцца млына для Ціхона — тое ж, што аддаць сваю душу, таму ён пагаджаецца падпісаць гэтую д'ябальскую дамову, упэўнены: «Людзей жа прадаваць не буду». Праз пэўны час да Ціхоновага млына выйшлі з акружэння параненыя байцы і знайшлі прытулак, хоць млынар рызыкаваў і сваёй галавою, і жыццём усёй сям'і: «Як добра, што вада / Заўжды збягала з грэблі, з кола! / Натужны кашаль — схованых бяда — / Не чуцен быў з таго падполля...» [3, с. 150]. Недзе ў сярэдзіне вайны, піша А. Ягадніцкі, у млын завітаў госць з лесу і прапанаваў млынару атрутны парашок, каб той укінуў яго ў мліва, прызначанае для немцаў. Але Ціхан наадрэз адмовіўся, хоць гэта таксама было рызыкоўна. «Не-е-е, галубок! / Дар божы, хлеба кус, / Атрутай бэсціць не бяруся: / Сваім ён можа трапіць на абрус! / Як ад граху я адмалюся?» [3, с. 152]. Аргумент «Вайна ўсё спіша» яго таксама не пераканаў.

Сям'я Сарокаў усё больш уцягваецца ў млыновае кола лёсу. І нават ужо з'яўляецца думка: «Мо лепш ад млына адцурацца?» [3, с. 152]. Пабываўшы пад арыштам і катаваннямі ў паліцыі і не выдаўшы сваіх начных гасцей, Ціхон яшчэ больш адчаяўся. Але праз колькі дзён прыйшла вестка, што партызаны ўзарвалі машыну з яго катам. Узнікла надзея, што згарэла разам з партфелем і злашчасная падпіска пра супрацоўніцтва. На гэтым этапе свайго жыцця млынар стаў партызанскім сувязным: «Насіў лістоўкі, ёд і лекі. / Спачатку ўцяклі кудысьці сны, / А потым — звыкся з небяспекай...» [3, с. 156]. Але яна падпільнавала яго з іншага боку: «Як сціх за Бугам вызвалення гром — / Ўзяліся за варожых слугаў. / Прыйшлі чамусьці за млынаром, Хоць ён не быў раўнёй падлюгам» [3, с. 157]. Абвінавачаны ў супрацоўніцтве з акупантамі Ціхон не мог апраўдацца перад следчым і даказаць сувязь з партызанамі. Следчы крычаў: «Не верю! Справку дай мне, хитрый змей!» [3, с. 161]. У выніку млынар быў асджаны на 10 гадоў без права перапіскі: «Наперадзе былі КарЛАГ, Дальбуд ды бераг Калымы няблізкі...» [3, с. 162]. Адарваны ад радзімы і сям'і, Ціхон часта разважае пра свой лёс, у якім млын адыграў вызначальную ролю. Гэты млын, а пры ім сад пакінуў у пасаг сваёй дачцэ Алене Ціхонаў цесць. Алена ў ростані з мужам суцяшае сябе сузіраннем мілых з дзяцінства і юнацтва мясцін, згадвае шчаслівыя дні заручын і вяселля: «Прагледзеўся рачулкі беражок / З чаромхай — сведкай іх спатканняў — / І ўзняты грэбляй дзедаўскі ставок, / І кола млына ў пырскаў ззянні» [3, с. 191]. Разам з тым А. Ягадніцкі прасочвае, як з цягам часу млын перастае быць аб'ектам «чыстай красы» і сямейнага дабрабыту, парушаюцца спакой і гармонія існавання. «Сям'і кармільцам добрым быў пасаг, / Ды злом стаў пры савецкай уладзе: / Лепш бы растаў, як ад біча пісяг / На таямнічай воднай гладзі! / Уратавала тое,што млынар / Не прызнаваў наёмнай працы, / А то б пайшоў сячы тайгі гушчар / Ці ў норах шахтаў задыхацца! / Затым наплыў вайны крывавы вір, / Загрукаталі жорны згубы…» [3, с. 171].

Ціхон у выгнанні пакутуе не толькі фізічна. Лёс рыхтуе яму трэццяе выпрабаванне: у лагеры ад яго патрабуюць стаць «стукачом». Герой супраціўляецца: «Я ўжо адну паперку падпісаў, / Я ўратаваў людзей ад смерці, / За гэта аж «дзясятку» атрымаў: / Адсыпалі па поўнай мерцы! / Цяпер я, непісьменны і тупы, / Баюся круцяльні паперак, / Баюся зноў патрапіць пад цапы, / Стаць умалотам паняверак» [3, с. 184]. Ад безвыходнасці Сарока гатоў нават кінуцца на калючы дрот і загінуць. Нечакана лагерны начальнік злітаваўся, бо атрымаў вестку, што жонка нарадзіла яму двух сыноў…

Пасля смерці Сталіна прыйшоў час вызвалення з нявolі. Першыя ўражанні ад сустрэчы з родным краем — гэта гара Міндоўга. Аднак не толькі яна: «З яе вяршыні Ціхон бачыў лес, / Што засланіў млын і запруду... / Адтуль прывёз Алене на замес / Ён першы раз мукі паўпуда» [3, с. 212]. Сустрэча з сям'ёй, жонкай і ўжо замужнімі дочкамі не толькі прынесла Ціхону радасць, але і абудзіла драматычны роздум пра лёс сумленнага працаўніка, гаспадара, уласніка на пераломах гісторыі. «Эх, дзеткі, каб жа не няшчасны млын / Ды паліцэйская інтрыга — / Ніхто б не зацягнуў мяне ў злачын, / Не быў бы бацька ваш латрыгай» [3, с. 206]. Між тым жыццё нібыта паступова наладжваецца, тым больш што Ціхон сустракае «ляснога чалавека» Лёву, жывога сведку яго супрацоўніцтва з партызанамі. Былы млынар становіцца шаўцом, бавіцца з унукамі. Аднак жорны лухты яшчэ не спыніліся, працягваюць сваю разбуральную работу. Аднойчы ўнучка прыходзіць дадому заплаканая. Як высветлілася, бацька суседскага хлапчука казаў: «Што расстраляць дзядулю трэба: / Ён шмат людзей камусь папрадаваў, / А сам душыўся белым хлебам!..» [3, с. 217]. Гэтая вестка давяла Ціхона да роспачы. «Казалі людзі, што мо дзён са тры Сароку бачылі ля млына, / На замку, на Міндоўгавай гары, / А больш — ля ўласнае адрыны. / Падоўгу нерухома ён стаяў, / Глядзеў удаль і штосьці думаў, / На рэплікі Алены не зважаў, / Затым сказаў: — Пайду да кума! / Пайшоў — і знік і не прыйшоў дамоў!» [3, с. 218]. Каб не рабіць ганьбы сваім нашчадкам, Ціхон Сарока скончыў жыццё самагубствам, пакінуўшы запіску: «Чым гэдак жыць, то лепш памерці!» [3, с. 219]. Яго смерць уразіла землякоў. Больш пякучым стаў боль родных, калі прыйшоў ліст ад Лёвы, у якім паведамлялася, што

Репозиторий БарГУ

ён знайшоў тую аптэкарку, што перадавала медыкаменты для партызан праз Ціхона ў атрад. Але вестка сталася запозненай… «— Ах, як жа затрымаўся гэты ліст! / — Ўздыхалі цяжка тры жанчыны. / — Мы б з таткам з чыстага жыць пачалі, / Не сталі б гнуць прад плёткай спіну!» — ліліся слёзы, але ўжо і «…праменьчык гордасці заззяў / У іх вачах, хоць і нясмела, / І скрухі цень святлейшым стаў, / І плямы з мараў адляцелі..» [3, с. 221]. На пачэсным сходзе ў райвыканкаме сям'ю Сарокаў ушанавалі за подзвіг іх бацькі ў час вайны. Прамоўца казаў: «Таварышы! У грозны час вайны / Быў сувязным Ціхон Сарока, / Ён стаў ахвярай злой маны / І не стрываў людскіх папрокаў. / Няма змаганца у жывых, на жаль, / Але лухта з яго сарвана! / Хай будзе ўцехай для сям'і медаль / Вайны народнай партызану!» [3, с. 222]. Так завяршыўся рух жыццёвага кола млынара Ціхона Сарокі, спыніліся ўрэшце жорны лухты.

У фінале паэмы А. Ягадніцкі зноў звяртаецца да матыву млына, але ўжо ў філасофска-эстэтычным плане. Мароз і завея стварылі ў зімовым Навагрудку атмасферу харства, намялі, па яго словах, «Сумёты мліва з дыяментаў: / Відаць, адзін сусек пад Ражаство / Зіма спустошыла дашчэнту...» [3, с. 223]. Паэт хоча, каб і гэтае харство, і гістарычная памяць не згінулі бясследна, бо, як ён скрушна піша, народ «з мліва, што наўкол блішчыць, / Не ўмее напячы нічога!» [3, с. 223]. Калі ж ён запытаў у маладых, што ведаюць пра млын і жорны, то адказалі: «— Штосьці ля вады, / Мо банк на востраве афшорным...». Паэт разумее, што жыццё мяняецца: «Цяпер млыны — у глыбіні вякоў, / Навокал — іншыя сюжэты, / Няма ідэалогіі акоў, / У моладзі — другія мэты» [3, с. 224]. І ён думае пра тое, як добра б было, каб людзі ўрэшце «дружнай талакой / Загналі ў дол лухту і звягу» [3, с. 224], знішчылі зло і цемру, якія «дабро дратуюць і крадуць святло…» [3, с. 224].

**Заключэнне.** Як паказвае аналіз паэмы ў адзінстве зместу і формы, А. Ягадніцкі ставарае настальгічны вобраз млына як амаль зніклай рэаліі беларускай прыроднай, культурнай прасторы і як сімвалічны асяродак духоўнага жыцця асобы. У спакойныя часы локус млына асэнсоўваецца як тэрыторыя спакою і гармоніі, свабоды гаспадарання, а млынар выяўляецца як самадастатковая асоба. У пераломныя часы лексемы «млын», «жорны» дзякуючы свайму метафорыка-сімвалічнаму патэнцыялу не проста называюць жыццёвыя рэаліі, а выступаюць «знакамі бяды» ў лёсе селяніна-гаспадара і ўвасабляюць трагедыю народа [4].

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Акудовіч, В.* Код атсутнасці. Асновы беларускай ментальнасці / В. Акудовіч. — Мінск : Логвінаў, 2007. — 216 с.
2. *Лассан, Э.* Лингвокультурология. Очерк русской концептологии / Э. Лассан. — Vilnius : Vilniaus pedagoginio universiteto leidukla, 2008. — 140 p.
3. *Ягадніцкі, А.* Выбраныя творы / А. Ягадніцкі. — Баранавічы : Выдавец А. Г. Хахол, 2018. — 230 с.
4. *Белая, А. І.* Млын, хутар і малатарня ў святле мастацкай умоўнасці / А. Белая // Абрысы роднага. Нацыянальныя локусы культуры ў беларускай прозе «эпохі рубяжа» : манаграфія / А. І. Белая ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Баранав. дзярж. ун-т. — Баранавічы : БарДУ, 2015. — С. 155—173.



УДК 821.163.3:82-31



**Я. У. Кавальчук**

*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*


## «ПАДВОЙНАЕ БАЧАННЕ» Ў РАМАНЕ ГЕОРГІЯ МАРЧУКА «КВЕТКІ ПРАВІНЦЫІ»

**Уводзіны.** Імя Г. Марчука, пісьменніка, сцэнарыста, рэжысёра, драматурга, шырока вядома не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. «Кветкі правінцыі» — адзін з найбольш значных эпічных твораў пісьменніка. Даследаванні, прысвечаныя гэтаму раману, скіраваны да тэмы «малой» радзімы, спавядальнасці, жанравай поліфанічнасці тэксту, яго аўтабіяграфічнага пачатку, звароту аўтара да традыцыйных, народных каштоўнасцей [1; 2; 4]. У дадзеным артыкуле зроблена спроба асэнсаваць спалучэнне дзіцячага і дарослага поглядаў «я-героя», асаблівасці іх выяўлення ў рамане «Кветкі правінцыі».

**Асноўная частка.** Матыў сіроцтва займае ў рамане асаблівае месца, і гэта зразумела: аўтар быў сіратою таксама. Рана застаўшыся без маці, Адась Доля, герой рамана, пакутліва шукае дарогу ў самастойнае жыццё. Яго вобраз «адлюстроўвае рэтраспектыўнае асэнсаванне аўтарскай біяграфіі, звязанай з жыццём у Давыд-Гарадку, з маладосцю, юнацтвам... Адася, як і самога аўтара, жыццё выпрабоўвала на трываласць з дзяцінства: мамы рана не стала, а выхаванне ўзяла на сябе бабуля» [1, с. 265]. Сіроцтва героя ўскладняецца яго хваробай, змаганнем за ўласнае жыццё.

Праблему сірочага дзяцінства, пошуку сэнсу жыцця Г. Марчук раскрывае з пазіцый «я-героя» дзіцяці і дарослага чалавека. Крытык П. В. Васючэнка вызначае мастацкую форму «падвойнага бачання» ў творах В. Казько («Суд у Слабадзе», «Высакосны год») [2, с. 731]. На нашу думку, спалучэнне дзіцячага і дарослага поглядаў, існаванне «я-героя» ў розных узростах, яго глыбокая самарэфлексія, трагічнасць


© Кавальчук Я. У., 2019



Репозиторий БарГУ